УДК У398.4(=161.3)+398.3(=161.3)

# АДЛЮСТРАВАННЕ МАГІЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ НАШЫХ ПРОДКАЎ У ФАЛЬКЛОРЫ

**І.В. Казакова**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
пр-т Незалежнасці 4, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь
irina_sml@bk.ru

**Анатацыя**. У дакладзе разглядаецца адлюстраванне магічнай свядомасці нашых продкаў ў фальклоры, прыводзяцца прыклады выкарыстання замоў  у беларускай сямейнай абраднасці.

***Ключавыя словы:*** фальклор, магічная свядомасць, замовы, радзінныя абрады, шлюбныя абрады, пахавальныя абрады,публікацыі беларускіх замоў

# ОТРАЖЕНИЕ МАГИЧЕСКОГО СОЗНАНИЯ НАШИХ ПРЕДКОВ В ФОЛЬКЛОРЕ

**И.В. Казакова**
Белорусский государственный университет
пр-т Независимости 4, 220004, Минск, Республика Беларусь

**Аннотация**. В докладе рассматривается отражение магического сознания наших предков в фольклоре, приводятся примеры использования заговоров в белорусской семейной обрядности.

***Ключевые слова:*** фольклор,магическое сознание, заговоры,родильные обряды, свадебные обряды, похоронные обряды, публикации белорусских заговоров.

# REFLECTION OF THE MAGICAL CONSCIOUSNESS OF OUR ANCESTORS IN FOLKLORE

**I.V. Kazakova**
Belarusian State University,
Independence Avenue, 4, 220004, Minsk, Republic of Belarus

**Annotation**. The report examines the reflection of the magical consciousness of our ancestors in folklore, provides examples of the use of spells in Belarusian family rituals.

**Keywords**: folklore, magical consciousness, spells, childbirth rituals, wedding rites, funeral rites, publications of Belarusian spells.

Калі гаворка ідзе пра магію, то часцей за ўсё маюць на ўвазе тры розныя з'явы, тры розныя сістэмы вераванняў і ўздзеянняў на навакольны свет і людзей: простую або ніжэйшую магію, якая выяўляецца ў культуры любога народа і ў любы гістарычны час – ад глыбокай старажытнасці да сучаснасці; чорнае чараванне часоў сярэдневечча; нарэшце, язычніцтва, якое таксама можна рэканструяваць праз фальклорныя творы.

Магія белая і чорная, ніжэйная і вышэйшая, побытавая, цырыманіяльная, рэлігійная, натуральная, народная, магія фарбаў і раслін, водараў і сноў, лічбаў і секса, і розная іншая. Шмат чаго ў ёй змянілася. Аказалася, што значная частка чароўных ведаў і рамёстваў адыйшла ў нагляд навуцы, якая растлумачыла, што ў іх няма ніякай містычнай таямніцы, а ёсць складаная і рэдкая прыродная з'ява і ўменне выкарыстоўваць яе. Значна паменшылася тэрыторыя магічнага царства. Усе экстрасенсорныя здольнасці чалавека страцілі свой чароўны арэол і перайшлі ў разрад з'яў, якім навука дала права на жыццё ў матэрыяльным свеце і, якія сталі актыўна вывучыць і выкарыстоўваць зноў жа для матэрыяльных патрэб. Магія раслін пераўтварылася ў народную (ці нетрадыцыйную) медыцыну. Тэлепатыя, яснабачанне, псіхакінез, левітацыя і іншыя чароўныя здольнасці чалавека былі цалкам атабраныя ў «прыслужнікаў злых сіл» і растлумачаны пры дапамозе біялагічнай энергіі і  новых тэорый.

Але вера ў звышнатуральныя сілы, у іншасвет і чараўніцтва пранікае ў нас тысячамі патаемных сцяжынак. Усё, што ўвайшло ў гісторыю, увайшло і ў чалавека. Культура кожнага народа, калі разглядаць яе ў сусветным кантэксце захавала тую касмічнасць, тую еднасць, якая так неабходна нам зараз. Менавіта ў народных традыцыях, святах, абрадах, звычаях адбілася непасрэдная сувязь чалавека з прыродай, з космасам, з касмічнымі сіламі. Нездарма пра беларусаў кажуць, што яны захавалі рэшткі язычніцкага светапогляду.

Гэтаму ёсць шмат пацвярджэнняў. Адметнай рысай беларускай культуры, асабліва фальклору, з'яўляецца вельмі спецыфічнае стаўленне да прыроды і яе таямніц. Цікава, што на пэўных тэрыторыях Беларусі (асабліва на Магілёўшчыне і Гомельшчыне) захаваўся не толькі ўспамін пра старажытную магію, але магічнае мысленне жыхароў беларускіх вёсак жыве і сёння, арганічна пераплятаючыся з сучаснымі поглядамі на свет.

Калі звярнуцца да фальклору як першакрыніцы этнасу, можна прасачыць, як поўна і рознабакова адлюстраваліся самыя розныя віды магіі ў народных рытуалах, паэтычных творах.

Звернемся да аднаго з самых старажытных жанраў фальклору – замовы. Што такое замова? «Замова – гэта своеасаблівая славесная формула, якая

паводле прымхлівых уяўленняў мае магічную сілу – здольна абавязкова ўздзейнічаць у пажаданым кірунку на знешні свет» [1, с. 108].

Як вядома, магічныя дзеянні амаль заўсёды суправаджаліся заклінаннямі. Слова наогул з'яўляецца адным з самых асноўных сродкаў магіі. Вера ў магічную сілу слова была заўсёды вельмі моцнай. Месца і значэнне заклінанняў у абрадзе вызначалася іх сутнасцю. Яны мелі тую ж дамінантную функцыю, што і ўвесь абрад цалкам. Мэтай іх было паўплываць на навакольны свет, выклікаць неабходную з'яву. Слова ўспрымалася як дзеянне. Яно арганічна злівалася з дзеяннем, тлумачыла і як бы замацоўвала яго. Адным з першых на магчымасці слова ў замовах засяродзіў увагу М. Крушэўскі. Ён вызначыў замовы як «выказанае словамі пажаданне, злучанае з пэўным абрадам ці без яго, пажаданне, якое павінна абавязкова здзейсніцца» [2, с. 23].

Заклінанне заўсёды мела выразна акрэсленую магічную функцыю і вымаўлялася з мэтай выклікаць пажаданы вынік. Менавіта з магічных заклінанняў і ўзнік самы архаічны жанр фальклору – замовы.

Шмат вучоных займаліся даследаваннем замоў і агульнымі пытаннямі чарадзейства. Гэта і М. Доўнар-Запольскі («Чародейство в Северо-Западном крае в XVII-XVIII в.в. Історіко-этнографіческій этюд») і І.А. Берман («Чаровники и знахари северо-западного простонародья»). Разглядалі замовы Я. Ф. Карскі, К.П. Кабашнікаў, М.Я. Грынблат, М.Я. Янкоўскі, грунтоўна даследавала беларускія замовы Г.А. Барташэвіч.

Сярод публікацый беларускіх замоў вылучаюцца зборы Е.Р. Раманава, П.В. Шэйна, А. Шлюбскага, У.М. Дабравольскага.

Прыклады двух тыпаў ужывання замоў, улічваючы агульнапрынятую функцыянальную і тэматычную іх класіфікацыі, у час таго ці іншага народнага абраду (каляндарнага ці сямейнага) і карыстанне замовамі без сувязі з абрадавымі дзеяннямі, раскрываюць дамініраванне магічнага мыслення ў народным светаўспрыманні і ў самыя важныя моманты жыцця, у час правядзення ўрачыстых рытуалаў, і проста ў паўсядзённым побыце.

У беларускіх сямейных абрядах захаваліся амаль усе віды магіі. Натуральна, што кожны магічны рытуал у час правядзення гэтых абрадаў суправаджаўся пэўнай замовай.

На першым месцы сярод сямейных абрадаў стаяць радзіны. Радзінная абраднасць і паэзія захавалася ў беларусаў лепш, чым у іншых усходніх славян і адносіцца да спецыфікі беларускага фальклору. Нараджэнне чалавека на свет – адна з самых вялікіх таямніц прыроды. Дзіця пачынае сваё жыццё яшчэ тады, калі знаходзіцца ў целе маці. Таму важнае значэнне набывае ў перыяд цяжарнасці жанчыны ахоўная магія, рытуалы якой суправаджаліся пэўнымі заклінальнымі слоўнымі формуламі (замовамі).

Вось, напрыклад, замова, якая ахоўвае ад сурокаў і выкідышу маладую жанчыну на самым пачатку цяжарнасці:

“Гасподзь, Святы Стваральнік! Матухна Прысвятая Багародзіца! Святая (уласнае імя) – заступніца! Дзякуй Вам! Бараніця, спасіця, да шчаслівага канца давядзіця! Захініця ад глазу ліхога, ад чалавека злога, ад сполаху і бяды, ад чорнай вады. Тройчы тры, Святая Троіца! Пачуйце мяне рабу Божыю (імя) памажыце мне, і беражыця мяне. У імя Айца і сына і Святога Духа! Амінь”[1]. Або: “У Імя Айца і сына і Святога Духа! Госпадзі спасі і барані! Царыца нябесная! Дай мне рабе Божай (уласнае імя) заступу і ахову! Ад глазу дурнога, чалавека ліхога, ад злой бяды, ад чорнай вады”[2].

Маці цяжарнай жанчыны магла прачытаць над спячай дачкой спецыяльную замову “на людскую любоў”: “Стану я, раба Божая, раніцай, блаславяся і перахрысцяся; выйду я на чыстае поле, на зялёны лужок. На тым лужочку прыгорачак стаіць, на тым прыгорачку кусточак расце, на тым кусточку ружа цвіце. І як з любоўю глядзяць на яе ды зарацца, дык хай і на дачку маю рабу божыю (Імя) з добрай любоўю глядзяць ды зарацца старыя старухі, старыя старцы, маленькія дзеткі, красныя дзеўкі і маладыя малодкі. Будзьце словы мае крэпкія, як ключы падзямельныя. Блаславенне маці, блаславенне Божае. Амінь”[3].

Чым бліжэй надыходзіў час родаў, тым больш узрастаў клопат і пепакой будучай маці і яе родных. Ахоўныя замовы маюць месца і ў час непасрэднай блізкасці надыходу родаў.

Тут ужо выразна гучыць просьба паслаць лёгкія, непакутлівыя роды. Напрыклад: “Сахрані, Гасподзь, абарані, дай у час пачаць лёгенька радзіць, хутка ўстаць, мацер Божая, заступіся за мяне, Хай ніхто не чуець, не ведае, толькі я адна, раба Божая (уласнае імя)”[4].

У час родаў, таксама вымаўляліся замовы, каб паскорыць роды і палегчыць пакуты парадзіхі.

“Госпадзі Божа, благаславі, і маць Прачыстая, памажы! Упрашаю Госпада Бога і Яна Хрысціцеля, закрывайця, зберагайця сваім часным храстом. Як на мор’і, на лукамор’і там ляжыць белкамень, а на том камні сядзіць мацер Божая Бугуродзіца Трыярушніца, гасподнія, божыя прэпадобніца. Упрашаю ж я Госпада: Бога, кожную часіначку, кожную гадзіначку – апрастай, Госпадзі, рабу божыю (імя); пусьці, Госпадзі, ету

---

[1] Запісана І.В. Казаковай у Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна вёсцы Трасціно ад Дземкінай М.І. (усе наступныя прыклады з Магілёўскай вобл. запісаны той жа).

[2] Зап. у вёсцы Канаўка Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна ад Касьянавай А.І.

[3] Зап. у вёсцы Канаўка Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна ад Сідарэнкі А.А.

[4] Зап. у вёсцы Трасціно Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна ад Дземкінай М.І.

душухну, нарождзеную, сатвараную на еты свет на будушчы век. Жыў Бог – жыва й душа”.

У час родаў парадзісе магла спатрэбіцца лекарская дапамога, таму вельмі важным лічылася веданне розных лекавых замоў. Напрыклад, існуе шмат замоў ад крывацёку.

“Ішла святая Прачыстая матка Хрыстова гарою, нясла ваду дугою. Дуга разагніся, вада, разалліся! Дуга разагнулась, вада разлілася, а ў рабы божай кроў сунялася, печанай запяклася”.

Вялікую небяспеку ўяўляла для жанчын “пасляродавая ліхаманка (або “пасляродавая гарачка”), ад яе таксама існуе шмат замоў, напрыклад:

“Устану я, раба Божая (імя), блаславясь, пайду перахрысцясь з дзвярэй у дзверы з варот у вароты, пуцём-дарогаю да сіняга акіяна-мора. У гэтага акіяна-мора стаіць вялікі дуб. На гэтым вялікім дубе ёсць залатая ветка. З другога боку акіяна-мора выходзяць жанчыны зялёныя, праставалосыя, яны па міру ходзяць, адбіваюць ад сну, ад яды, сасуць кроў, цягнуць жылы, як чэру точаць чорную пячаль, піламі піляць жоўтыя косці, б’юць і трасуць белае цела. Зламлю я залатую ветку з Вялікага Дуба, тры разы махану, дарогу ім замкну, да рабы Божай (імя, каго лечаць) не пушчу. Слова мае, рабы Божай (імя), крэпка, Мацер Божая мне заступніца, памоцніца”[5].

Вельмі важным для здароўя нованароджанага была наяўнасць матчынага груднога малака, таму існуе шмат замоў на захаванне яго супраць мастыту (грудніцы).

“Мацер Божая Прачыстая ішла, залатое вядзёрачка нясла, з пядзерачка чыстую вадзіцу ліла, як у тым залатым вядзерачку вадзіца пе сканчвалася, а папаўнялася, так і ў рабы божай (імя парадзіхі) грудзі малаком наліваліся, папаўняліся, ды не стылі, і не балелі”[6].

У пасляродавы перыяд зноў важнае значэнне набывае ахоўная магія. Трэба было засцерагчы маці нованароджанага ад дурных вачэй, ад сурокаў, ад хвароб і смерці, ад злоснага чаравання.

“Першым разам добрым часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай мацеры пакланюся. Другім разам доўгім часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай мацяры пакланюся. Трэцім разам божым часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай мацяры пакланюся. Малю, умаляю, упрошваю адвесці ліха злое, гора ліхое, усякія хворасці і безурэменную смерць ад рабоў Божых (імя маці і дзіця). Мацер Божыя Прачыстая адмалі іх, абарані ад злога вока, ад чорнага калдуна”[7].

---

[5] Зап. у вёсцы Трасціно Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна ад Раманенка С.Р.

[6] Зап. у вёсцы Трасціно Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна ад Раманенка С.Р.

[7] Зап. у вёсцы Канаўка Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна ад Касьянавай А.І.

Ахоўная магія выкарыстоўваецца і ў час правядзення пахавальнага абраду. Вядомы замовы, якія павінны былі недапусціць шкоднага ўплыву нябожчыка на жывых або замовы, якія не давалі, смерці вярнуцца ў вёску ў час, калі жалобны картэж вяртаўся пасля пахаваннял могілак: "Бярыце мяцежныя птушкі горсць зямлі, бярыце звери к грядушчым дзеры... цьфу, цьфу, цьфу... Вырата глыбокаяі яма. Нябожчыку (імя) дарога прама. Нам ісці крыва. Чатыры сілы памажыце, ход пад зямлю закрыця. Усё, што трэба аддаем, самі тут застаемся. Слова мае крэпка, крэпка. Цьфу, цьфу, цьфу..."[8] або "У імя айца і сына і святога Духа! Госпадзі саздацель наш нябесны, матухна-заступніца Прасвятая-Багародзіца, святыя ангелы заступнікі! Памажыця, спасіця, адламіця ад безурэменнай смерці, смерць прыпыніця, за намі не пусціця. Амінь"[9].

Розныя віды магіі атрымалі шырокае распаўсюджанне ў шлюбнай абраднасці. На ўсіх этапах вясельнага абраду беларусаў безумоўна пераважае магія любоўная, поруч з ёй прысутнічае ахоўная магія, каб абараніць маладых ад сурокаў і злоснага чаравання. Наогул замоў ад шкоднага ўлыву чараўнікоў і сурокаў існуе вельмі шмат, сярод іх наступная:

"Закрываю вочы, затыкаю вушы, замыкаю рот, адымаю рукі і ногі ў злога калдуна, чортава прыслужніка. Як не лётаць змяі ў небе, так не рабіць табе шкоды. Соль табе ў вочы, палена табе ў калена. Цьфу, цьфу"[10].

Замовы арганічна уваходзяць у структуру і каляндарных, і сямейных абрядаў і існуюць асобна ў пэўных магічных рытуалах. Побач стаіць і магія слова ў песняпеннях, магія спеву. Амаль усе народныя звычаі, святы, абрады на розных этапах проста прасякнуты песнямі. Свае мары, надзей, жаданні народ выказваў у песнях і верыў, што яны здзяйсняцца.

Магічныя дзеянні павінны былі захаваць здароўе і доўгае жыццё, адвесці сурокі і злыя сілы, падказаць будучы шлюб і забяспечыць добры ўраджай. Сувязь чалавека з акаляючым светам разумелася вельмі канкрэтна. Свет у народнай свядомасці іерархічны, усё мае сваё месца, знаходзіцца ва ўзаемасувязі, усе адыгрывае пэўную ролю ў жыцці чалавека

Веданне і правільнае правядзенне спецыфічных абрадавых дзеянняў і рытуалаў уваходзіла ў кодэкс выхавання дзяцей і моладзі. Добрае веданне і дэталёвае выкананне традыцыйных звычаяў і абрадаў адыгрывала немалаважную ролю ў фарміраванні станоўчай ці адмоўнай грамадскай думкі аб той ці іншай сям'і, што мела вялікае значэнне для апошняй. Нашы продкі звярталіся за дапамогай да старажытных белых альбо чорных магаў

[8] Зап. у вёсцы Слабада Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна ад Прошкінай М.І.

[9] Зап. у вёсцы Канаўка Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна ад Сідарэнкі А.А.

[10] Зап. у вёсцы Маркаўка Магілёўскай вобласці Хоцімскага раёна ад Гаўйрыленкі М.А.

(панароднаму – да знахараў і чараўнікоў). Да гэтых людзей у вёсках ставіліся з павагай альбо з насцярожанасцю. У адрозненне ад іншых народаў беларускія вяскоўцы не мелі глыбокай нянавісці да тых, каго лічылі чараўнікамі (або ведзьмамі), хоць і стараліся засцерагацца ад магчымасці іх шкоднага ўплыву. Знахары і знахаркі карысталіся пашанай і былі самымі жаданымі гасцямі ў час адзначэння важнейшых сямейных свят: хрэсьбін, вяселля і г.д. І ў наш час у складаных жыццёвых сітуацыях людзі звяртаюцца за дапамогай да народных знахараў і знахарак. Шмат такіх людзей, якія найбольш набліжаны да таямніц прыроды, жыве ў беларускіх вёсках і сёння.

Хуткае развіцце сучаснай навукі не павінна захінуць ад нас скарбы народных ведаў пра жыццё і сусвет. Народная культура, калі разглядзець яе ў розных аспектах, можа даць нам ключ для разумення таямніц прыроды, фарміравання здаровага светапогляду, збалансавання ўстойлівасці псіхікі і філасофіі мыслення, дапаможа асэнсаванню новай, сучаснай, аб’ектыўнай агульнай выявы свету.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Беларуская вусна-паэтычная творчасць. Мн., 1988.

2. Крушевский, Н. Заговоры как вид русской народной поэзии // Варшавские университетские известия. Варшава, 1876. № 3.